УДК 37.017.4:37.035.6(476) “13/14”

# ТРАДЫЦЫЯНАЛІЗМ ЯК ПРЫНЦЫП ВЫХАВАННЯ ПАТРЫЁТА І ГРАМАДЗЯНІНА Ў ПЕДАГАГІЧНАЙ ДУМЦЫ БЕЛАРУСІ XIV–XV стст.

**Шчэрбін Марына Міхайлаўна**
старшы выкладчык кафедры гісторыі і грамадазнаўчых дысцыплін
установы адукцыі “Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя І. П. Шамякіна”
(г. Мазыр, Беларусь)

*Ключавыя словы: пераемнасць, выхаванне, патрыёт, грамадзянін, педагагічная думка, традыцыйныя каштоўнасці,*

*У артыкуле разглядаецца пераемны характар грамадзянска-патрыятычнага выхавання ў педагагічнай думцы Беларусі XIV–XV стст. На падставе аналізу фальклорных дадзеных і гістарычных крыніц вызначаны значнасць традыцыйных каштоўнасцей і звычаяў у выхаванні асобы, аддана́й сваёму народу і Радзіме.*

Арыентаванасць на цесную ўзаемасувязь з мінулым, як форма спадчыннасці, з’яўляецца асновай развіцця народа, валодае значнымі педагагічнымі магчымасцямі. Народная мудрасць заўсёды адзначала неабходнасць прытрымлівання сваіх звычаяў у якасці важнай крыніцы захавання ўласнай самабытнасці. *“Воўк кожны год ліняе, а звычая не мяняе”*, – былі ўпэўнены нашы продкі [1, с. 42]. Нямецкі філосаф В. Вундт лічыў, што звычай мае найгалоўнейшае значэнне ў адлюстраванні “духу народа” побач з міфам і мовай [6, с. 30]. Звычай, на думку даследчыка, уяўляе сабой “агульны накірунак волі народа”, які адлюстроўвае архетыпы яго дзеянняў і паводзін у адносінах да ўсяго навокал [6, с. 30].

Традыцыяналізм, як “арыентацыя на даўніну і захаванне некалі прынятых узораў”, разглядаўся ў якасці важнай каштоўнасна-светапогляднай дамінанты сярэдніх вякоў [2, с. 65]. Моцныя сацыякультурныя асновы такой прыхільнасці абумовілі неабходнасць падтрымання адпаведнай сістэмы звычаяў і традыцый як увасабленне імкнення да дабрабыту свайго народа. На думку Ю.В. Чарняўскай, менавіта традыцыйныя каштоўнасці “складаюць нацыянальны вобраз, у спрошчаным выглядзе – мадэль свету”, якая вызначае жыццёвыя прыярытэты этнасу, уплывае на эвалюцыю яго выхаваўчых арыенціраў і рэлігійна-светапоглядных дамінант [6, с. 28]. Сярэдневяковыя фларылегіі, акцэнтуючы ўвагу на важным значэнні пераемнай сувязі пакаленняў праз захаванне сваіх звычаяў і традыцый, сцвярджалі, што *“сад, часто пересаживаемый, плода не приносит”* [5, с. 478].

Адданасць уласным здабыткам абумовіла грамадскую каштоўнасць традыцыяналізму на беларускіх землях у XIV–XV стст., які падтрымліваў



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

звычайнасць быцця. Прытрымліванне сваіх традыцый пазіцыяніравалася важным жыццёвым рэсурсам. *"Все новое хорошо, но старое – всего лучше и крепче"*, – адзначалі гістарычныя крыніцы [4, с. 496]. Апаведна захаванне сваіх звычаяў і традыцый выступала каштоўнай грамадзянска-патрыятычнай якасцю, адлюстроўвала адказнае стаўленне да свайго народа і Радзімы. Паколькі адданасць традыцыйным формам жыццядзейнасці мела значны патэнцыял у фарміраванні прыхільнасці канкрэтнай зямлі, народу, краіне.

Фальклорныя крыніцы таксама падтрымлівалі гэтую думку, слушна падкрэсліваючы, што *"без глыбокага кораня дуба не бывае"* [3, с. 85]. Важнае выхаваўчае значэнне мела паступовае далучэнне індывіда да фальклорнай і песеннай традыцый, удзел з дзяцінства ў каляндарнай і сямейнай абраднасці, выкананне разнастайных паўсядзённа-побытавых звычаяў і рэлігійных абрадаў – усё гэта спрыяла фарміраванню цікавасці да свайго мінулага, разумення неабходнасці яго захавання і абароны для наступных пакаленняў. Акрамя таго, абумовіла пэўны вектар этнакультурнага развіцця народа ў межах усходнеславянскай культурнай прасторы, што мела важнае значэнне для грамадзянска-патрыятычнага выхавання ў XIV–XV стст.

Традыцыйнасць для беларусаў як "адмысловая форма пераемнасці", на думку Т.І. Шамякінай, мела ярка выражаны патрыятычны характар, была накіравана на "захаванне нябачнай сувязі пакаленняў" [7, с. 238]. Ва ўмовах этнічнай ідэнтыфікацыі каштоўнасныя адносіны да сваіх звычаяў і традыцый рабілі больш мэтанакіраваным працэс фарміравання беларускай народнасці, садзейнічалі замацаванню ўласных асаблівасцей, ментальных пераваг і рэлігійных каштоўнасцей, прыхільнасць якім адыгрывала важную ролю ў грамадзянска-патрыятычным выхаванні XIV–XV стст.

Такім чынам, дамінаванне гісторыка-культурнага традыцыяналізму выступае важным прынцыпам грамадзянска-патрыятычнага выхавання ў педагагічнай думцы Беларусі XIV–XV стст., які садзейнічаў фарміраванню адказнасці асобы да пэўнай этнакультурнай супольнасці, разглядаўся важным сродкам захавання і перадачы маладым пакаленням ментальна-светапоглядных каардынат. Дадзеныя выхаваўчыя ідэі і сёння маюць значны педагагічны патэнцыял ва ўмовах захавання гістарычнасці і нацыянальна-культурнай пераемнасці як першаасноў арганізацыі выхаваўчага працэсу.

**Літаратура**


1. Антологія беларускай народнай прыказкі, прымаўкі, выслоўя / А.С. Фядосік. – Мінск: Навука і тэхніка, 1999. – 456 с.
2. Гуревич, А.Я. Категории средневековой культуры / А.Я. Гуревич. – М.: Искусство, 1984. – 350 с.
3. Лепешаў, І.Я. Тлумачальны слоўнік прыказак / І.Я. Лепешаў, М.А. Якалцевіч. – Гродна: ГрДУ, 2009. – 695 с.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

4. Наставление отца сыну // Памятники литературы Древней Руси. XIV – середина XV века / сост. и общая ред. Л.А. Дмитриева. – М.: Худож. лит., 1981. – С. 496–500.
5. Пчела // Памятники литературы Древней Руси: XIII век / общ. ред. Л.А. Дмитриева, Д.С. Лихачева. – М.: Худож. лит., 1981. – С. 474–486.
6. Чернявская, Ю.В. Народная культура и национальные традиции: пособие для учителей / Ю.В. Чернявская. – Минск: Беларусь, 2000. – 199 с.
7. Шамякіна, Т.І. Міфалогія Беларусі (нарысы) / Т.І. Шамякіна. – Мінск: Маст. літ., 2000. – 400 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова